# Астраўкі самарэалізацыі дацэнта Лашук

24.01.2019 11:51 Якасць адукацыі

**Яна была першай з дзяцінства. Вынік любой справы, за якую б ні бралася звышадказная і руплівая дзяўчына, павінен быць бездакорным. Медаль пасля заканчэння школы, чырвоны дыплом ва ўніверсітэце, вядомае імя навукоўца ў любімай прафесіі… Усё гэта пра дацэнта кафедры эканамічнай сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта кіраўніка Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў установы Ірыну Валер’еўну Лашук.**



Самымі жаданымі і доўгачаканымі задачамі ў школе былі для дзяўчыны заданні з зорачкамі: у іх заўсёды хавалася нешта больш прывабнае і захапляльнае. Ёй заўсёды хацелася раскласці з’яву па палічках, дакапацца да сутнасці. Пасля ў жыццё старannай і ўседлівай вучаніцы пачалі ўваходзіць гуманітарныя дысцыпліны і захапленне навукай.

Ірына Валер’еўна прызнаецца, што матуля-настаўніца змагла ўкласці ў яе правільнае выхаванне — гэта і паўплывала на сур’ёзныя адносіны да ўсяго, чым займалася дзяўчына. Разам з гэтым у яе жыцці з’явіліся заняткі музыкай: Ірына занялася асваеннем фартэпіяна. Ёй раілі паступаць у музычнае вучылішча, бо бачылі здольнасці і магчымасці дзяўчыны.

— Мне падавалася, што трэба быць або вялікім музыкантам або не быць музыкантам увогуле. Я падумала, што вялікай піяністкай не стану, таму вырашыла адмовіцца ад гэтай ідэі, — расказвае дацэнт. — Матуля бачыла мяне музыкантам, хацела, каб я працягвала займацца ігрой на фартэпіяна прафесійна. А я якраз пачула пра невядомую мне навуку — сацыялогію — і, паколькі інфармацыі па гэтым кірунку было няшмат, у школе такі прадмет не праходзілі, вырашыла заняцца гэтым пытаннем больш глыбока. Так трапіла ў БДУ.

Абітурыентку зацікавілі выкладчыкі ўніверсітэта, і дзяўчына цвёрда вырашыла тут застацца. У 1991 годзе Ірына Лашук паступіла на другі набор аддзялення сацыялогіі тады яшчэ філасофска-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яе залічэнне выпала на час станаўлення беларускай сацыялогіі. Па словах Ірыны Валер’еўны, у той перыяд

падручнікаў не было, паколькі дысцыпліна адраджалася. Адной з нямногіх крыніц інфармацыі для дапытлівых студэнтаў быў маскоўскі часопіс "Социс", які маладыя людзі хутка чыталі і доўга яшчэ пасля перачытвалі. Першыя сацыёлагі друкаваліся там урыўкамі, таму студэнты з нецярплівасцю чакалі выхаду наступнага нумара.

З музыкай Ірына Лашук думала развітацца назаўсёды. Але тады яна яшчэ не ведала, што пройдуць гады і сур'ёзнае захапленне перадасца яе дачцэ.

— Калі дачка вырашыла паспрабаваць сябе ў музыцы, я яе адгаворвала. Але, калі яна настаяла, мая пазіцыя змянілася і мы разам пачалі рыхтавацца да паступлення ў музычную школу, — успамінае Ірына Валер'еўна. — Сваё старое фартэпіяна прыйшлося вярнуць ад матулі. Цяпер музыка — гэта частка жыцця ўсёй нашай сям'і.

Праз некаторы час вызначацца з прафесіяй прыйшлося і старэйшаму сыну, які, маючы перад сабой прыклад матулі і яе адданасці выбранай справе, вырашыў таксама звязаць сваю дзейнасць з сацыялогіяй. Цяпер хлопец — першакурснік факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

— Сын ведаў, што гэта няпросты шлях: ад асабістых магчымасцей — да фінансавых момантаў. Моладзі часта хочацца ўсяго і адразу. А ў гэтай сферы павінна прайсці шмат часу, перш чым нечага можна будзе дасягнуць. Ён прааналізаваў усе "за" і "супраць", наведаў дні адкрытых дзвярэй на розных факультэтах і паступіў. Цяпер сыну цікава вучыцца, — дзеліцца дацэнт. — Ён уседлівы, спакойны, здольны да навуковай дзейнасці і, галоўнае, паважае яе. А выбера ён навуку ці аддасць перавагу нечаму іншаму, пакажа толькі час.

Пасля заканчэння БДУ Ірына Валер'еўна паступіла ў аспірантуру Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук, і неабходна было выбіраць тэму дысертацыі. У той час маладзёжная тэматыка і даследаванні ў гэтым кірунку падтрымліваліся і віталіся, быў доступ да баз з падобнымі даследаваннямі, таму Ірына Лашук вырашыла займацца сацыяльным развіццём моладзі ў беларускіх рэаліях. Пасля яе інтарэсы перайшлі ў бок маладзёжнай культуры з пункту гледжання аналізу паводзінскіх мадэлей.

Хутка ў даследчыцы выйдзе манаграфія, адзін з раздзелаў якой будзе прысвечаны менавіта маладым людзям. Прычым, па словах Ірыны Лашук, у яе працах даследавалася не толькі беларуская моладзь, але і прадстаўнікі Расіі, Літвы і іншых краін. Пры рабоце над даследаваннем спецыяліст выкарыстоўвала супастаўляльны аналіз, на аснове якога вылучала адметныя рысы юнакоў і дзяўчат, асаблівасці іх паводзін, мыслення і рабіла высновы аб іх адрозненні ці падабенстве.

— У нас па краіне створаны сеткі інтэрв'юераў, за якімі сочаць "брыгадзіры" (спецыялісты, якія адказваюць за правядзенне даследаванняў па рэгіёнах і кантралююць працэс згодна з атрыманымі ад нас інструкцыямі). Ідучы за інфарматызацыяй грамадства, пачынаем апрабоўваць і прымяняць на практыцы анлайн-апытанні. Пакуль што не ўсе сацыёлагі прытрымліваюцца аднаго пункту гледжання наконт гэтага метаду, паколькі, нягледзячы на яго аператыўнасць і даступнасць, ён можа ахапіць не ўсе пакаленні інтэрнэт-карыстальнікаў (у звычайных апытаннях прымаюць удзел 1—2 тысячы чалавек, электронны варыянт можа апрацаваць каля 4 тысяч чалавек). Гэты напрамак хацелася б таксама развіваць, — тлумачыць даследчык.

Адным з апошніх буйных даследаванняў, якое курыравала і ў якім прымала непасрэдны ўдзел Ірына Лашук, можна назваць праект па вывучэнні стэрэатыпных адносін беларусаў да Саюзнай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што вынікі работы былі падведзены ў лістападзе мінулага года, цікавасць да ягоназіраецца і сёння. Спецыялісту тэлефануюць з пытаннямі калегі з іншых універсітэтаў, якія прызналі якасць даследавання Ірыны Лашук і яго аўтарытэт у навуковым асяроддзі Беларусі.

Мысліцельная дзейнасць Ірыны Валер'еўны не спыняецца ніколі. Важнымі для даследчыцы заўсёды застаюцца канферэнцыі. Без іх вучоныя, на яе думку, губляюцца, перастаюць

заставацца ў трэндзе: такія сустрэчы дапамагаюць сачыць за новымі павевамі і тэндэнцыямі ў сваёй галіне. Найбліжэйшая паездка, якая чакае Ірыну Лашук, будзе ў Рыгу, дзе дацэнт прадставіць сваю ўстанову на міжнародным форуме.

— Пакуль на спецыяльнасць “Эканамічная сацыялогія” набіраюцца толькі 25 абітурыентаў, але нам хацелася б у будучыні набіраць яшчэ адну групу. Для гэтага трэба больш расказваць пра згаданую спецыяльнасць, бо мала хто чуў пра яе існаванне. Абітурыенты павінны зразумець, што пасля выпуску яны змогуць быць не толькі спецыялістамі выключна ў сферы сацыялогіі, ім можа адкрыцца свет навукі, бізнесу або шлях у маркетынгавыя службы і рэкламныя агенцтвы. Перспектыўнасць адпаведнай прафесіі пацвярджае і тое, што я як маці падтрымала выбар свайго сына. БДЭУ — адзіны ўніверсітэт краіны, які рыхтуе выпускнікоў па спецыяльнасці “Эканамічная сацыялогія”. Тут выкладчыкі больш накіраваны на практычнае атрыманне ведаў. Студэнты ўдзельнічаюць у вывучэнні пэўных працэсаў, сутыкаюцца з рэальнымі задачамі і нават зарабляюць на гэтым грошы. Мне гэта вельмі дапамагае, бо даводзіцца працаваць не проста са студэнтамі, а з ужо амаль сфарміраванымі прафесіяналамі.

Ірына Валер’еўна адзначае, што кожны яе студэнт добры па-свойму, яна ўсіх іх любіць. Нехта з іх можа не вывучыць штосьці, але яна лічыць гэта не самым галоўным паказчыкам вучобы. Дрэнных студэнтаў у яе няма.

— Калі даеш маладым людзям нешта рабіць самастойна, давяраеш — яны адразу мяняюцца: загараюцца цікавасцю вочы, з’яўляецца азарт. І тое, што яны робяць нешта на пачатковых этапах уласнаручна, фарміруе ў іх любоў да прафесіі — гэта куды больш важна. Хочацца, каб студэнты маглі заўсёды прымяняць свае веды, каб размяркоўваліся не проста “для птушачкі”, а з задавальненнем аддаваліся сваёй дзейнасці, прыносілі карысць. Дзеля нашых выпускнікоў мы часта сустракаемся з работадаўцамі: заказчыкі патрэбны нам, а мы патрэбны ім.

Ірына Валер’еўна прапаноўвае сваім студэнтам шмат матэрыялаў для самастойнага вывучэння. Выкладчык гаворыць, што яе найпершая задача — даць маладым людзям той матэрыял, які яны не змогуць знайсці ў іншых месцах, парэкамендаваць літаратуру, даць спасылкі. Таму Ірына Лашук заўсёды мабільная: са студэнтамі яны кантактуе і праз электронную пошту, і ў сацыяльных сетках.

— У кожнага спецыяліста ёсць шмат напрацовак, у тым ліку неапублікаваных, якія стануць карыснымі для свежых вачэй і галоў, калі будуць прывязаны да канкрэтнай тэмы заняткаў. На ўласным прыкладзе лягчэй расказаць і паказаць, як трэба нешта рабіць, прасцей звярнуць увагу на тое, як не трэба дзейнічаць ні ў якім разе. Мая мэта — даць студэнтам нешта ўнікальнае, а не пераказаць змест некалькіх падручнікаў. Гэта прынясе ім больш карысці. Па выніках, некаторыя прыклады дапамагаюць ім у курсавых і дыпломных работах, пры выкананні якіх моладзь рэалізоўвае свае даследчыцкія задумы.

У дачыненні да дзяцей Ірына Лашук лічыць сябе патрабавальнай маці. Па словах навукоўца, у яе сям’і няма паняцця “стаміўся — не стаміўся”, калі размова тычыцца завяршэння пэўнай справы, выканання абавязкаў. Дачка і сын Ірыны Валер’еўны рана сталі самастойнымі, зразумелі прынцып “скончыў работу — гуляй у ахвоту”. Іх не трэба прымушаць вучыцца ці правяраць. Яны бачаць, што бацькі ўвесь час заняты справай, таму прывучаюць да гэтага і сябе. Сын і дачка сумяшчаюць вучобу з актыўнымі заняткамі. Да справы бацькоў яны ставяцца з павагай, і, паколькі мама і тата працуюць шмат, лепшым адпачынкам падлеткі лічаць змену дзейнасці.

— Што ні робіцца — да лепшага, — пераканана Ірына Лашук. — Былі выпадкі, калі здавалася, што ў жыцці ўсё дрэнна, што ўсё добрае скончылася, а пасля сітуацыя нечакана паварочвалася і станавілася зразумела, што гэта самае выйгрышнае і карыснае выйсце з яе. Лёс выносіў на выратавальныя астраўкі. Гэта тычылася і развіцця прафесійнай дзейнасці, і здароўя блізкіх. Ніколі нельга адчайвацца, бо ніводзін з нас не ведае, куды яго ў выніку выведзе жыццё.

Зараз Ірына Валер’еўна працуе над доктарскай дысертацыяй. Яна цудоўны прыклад таго, што сумяшчаць сямейнае жыццё, прафесійную дзейнасць і самарэалізацыю ў многіх сферах — гэта зусім не міф, а дасягальная рэальнасць. За 25 гадоў сямейнага жыцця ў Ірыны Лашук не ўзнікла ніводнай перашкоды ў гэтым кірунку. Родныя вельмі хацелі, каб яна абараніла кандыдацкую дысертацыю, падтрымлівалі і ў побыце, і ў прафесіі.

— Колькі помню, мы заўсёды дапамагалі адно аднаму. Муж часта расказвае, якая малайчына яго жонка, хоць сам шмат чаго дасягнуў. Для яго гэта таксама значна. Мы з ім шмат працуем, умеем і адпачываць. Але самы лепшы дзень — гэта любы з працоўных, — прызнаецца Ірына Валер’еўна. — Мне нават у выхадныя неабходна працаваць. Часта можна пачуць, што ў выкладчыкаў нізкія заробкі і да таго падобнае. На гэта можна адказаць толькі адно: пішыце праекты, прасоўвайце іх, атрымлівайце гранты на развіццё — і ўсё акупіцца не толькі ў матэрыяльным плане.

На кніжнай паліцы маёй суразмоўніцы нельга знайсці раманы, дэтэктывы. Яна лічыць, што калі хочацца нешта прачытаць, то лепш звярнуць увагу на навуковы артыкул. Любімая кніга Ірыны Валер’еўны — гэта, безумоўна, кніга па сацыялогіі. Выкладчык цікавіцца такім напрамкам, як постмадэрнізм. Зараз яе настольная кніга — твор Джэфры Аляксандэра “Культуральная сацыялогія”. Па словах Ірыны Лашук, чытаць яе няпроста, не адразу паддаюцца пэўныя нюансы. Выкладчык звязвае гэта з асаблівасцямі перакладу. Яна часта думае, як высокія тэарэтычныя роздумы, выкарыстаныя ў рабоце, ператварыць у эмпірычныя даныя, каб нічога пры гэтым не загубіць. Ёй хочацца не тэарэтызаваць матэрыялы далей, а пераносіць гэты вопыт на рэаліі беларускага грамадства, разумець: гэты вопыт працуе ўсюды ці толькі ў канкрэтнай дзяржаве? Спецыяліст прызнаецца, што не чытае мастацкую літаратуру: няма калі, да таго ж яна заўсёды памятае, што мае шмат непрачытанай навуковай літаратуры. Мастацкасць падмяняецца навуковасцю.

Ірына Валер’еўна гаворыць, што самае каштоўнае для яе — здароўе бацькоў і блізкіх людзей. А для рэалізацыі ў прафесійнай сферы, як лічыць сацыёлаг, перашкод няма. Жыццё для яе — гэта самарэалізацыя ва ўсіх якасцях (жаночай, мацярынскай, сямейнай і прафесійнай).

— Мне здаецца, любую праблему можна вырашыць, — перакананa Ірына Лашук. — Раней з мужам часта спрачаліся: ён гаварыў, што ўсё ў жыцці прадвызначана, я даказвала, што чалавек сам сябе робіць. Маўляў, нішто не зможа мне перашкодзіць, калі я нечага захачу дасягнуць. Зараз жа разумею: чалавеку падуладна далёка не ўсё. Галоўнае ў любой сітуацыі — думаць пра тое, што ты збіраешся рабіць і да чаго гэта прывядзе, прадумваць ключавыя крокі. Калі ты заўсёды рухаешся, не стаіш на месцы, тады і задаволены сабой, і глядзіш на свет па-іншаму. Ты шчаслівы.

**Ірына ІВАШКА.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

https://nastgaz.by/astrauki-samarealizatsyi-datsenta-lashuk/